Горецкий выбор

Антибашистская газета

Башизм - «Репрессивный режим, направленный на подавление прогрессивных общественных движений, на уничтожение демократии».

С.И.Ожегов, «Толковый словарь руского языка», на букву «Ф»

№ 32, декабрь 2007г.

"Белсат" пачынае працу

Канал створаны ў рамках польскага грамадзкага тэлебачаньня пры ўдзеле ўраду Польшчы. Праект зацьверджаны і фінансуецца польскім парлямэнтам. Большасьць працаўнікоў "Белсату" — беларусы. Канал працуе на беларускай мове і адрасаваны найперш жыхарам Рэспублікі Беларусь. У плянах "Белсату" — вяшчаць таксама праз інтэрнэт. Пакуль што на сайце каналу http://belsat.home.pl/ можна паглядзець прамацыйны ролік.

Убачыць перадачу каналу "Белсат" можна праз спадарожнік "Astra", а ад студзеня 2008 году — праз спадарожнік "Sirius".

Севярын Квяткоўскі

ШТО ТАКОЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ БЕЛАРУСЬ?

Тэлебачанне Беларусь – гэта новы замежны канал Польскага тэлебачання, які будзе працаваць пад брэндам БЕЛСАТ / BELSAT TV. Фармальна ён быў зацверджаны 17 ліпеня 2007 году Галоўнай управай Польскага тэлебачання, хоць над яго стварэннем яшчэ з чэрвеня 2006 г. працавала група дасведчаных журналістаў з Польшчы і Беларусі пад кіраўніцтвам Агнешкі Рамашэўскай-Гузы, прызначанай на пасаду Дырэктара Тэлебачання Беларусь.

МІСІЯ КАНАЛА БЕЛСАТ

Місіяй Тэлебачання Беларусь з'яўляецца інфармаванне жыхароў Беларусі. Такім чынам у нашых перадачах:
- дакладная і незалежная інфармацыя пра падзеі ў Беларусі, Еўропе і свеце
- цікавыя кінафільмы
- сумленная публіцыстыка, у якой адлюстроўваюцца сапраўдныя праблемы, памкненні, пазыцыя і шанцы беларускага народу
- багатая культурная прапанова, дзе побач з традыцыйнай беларускай культурай будзе прадстаўлена таксама яе новае, авангарднае і еўрапейскае аблічча
- высокаякасныя моладзевыя перадачы з улікам тых цікавых музычных з'яваў, якія ўлады імкнуцца не дапусціць да масавага гледача
- аб'ектыўны й цікавы погляд на гісторыю Беларусі, СССР і Цэнтральнай Еўропы.

Што зрабіць, каб прымаць Белсат TV?

А. У мяне ёсць спадарожнікавая антэна, якая прымае сігнал спадарожніка Astra.

1. Усё проста! 10 снежня а 18:00 па беларускім часе (17:00 польскага часу) уключы тэлевізар і пашукай назву Белсат TV у спісе каналаў.
2. Калі не знойдзеш нас адразу, паспрабуй уключыць аперацыю SCAN, якая актуалізуе спіс каналаў.
3. Дадай Белсат TV да ўлюбёных, каб першая незалежная тэлевізія для Беларусі заўсёды была пад рукой!

Б. У мяне ёсць спадарожнікавая антэна, аднак яна скіраваная на іншы спадарожнік.

1. Гэта таксама проста! Пакруці антэну гарызантальна ўправа і ўлева, знайдзі сігнал Astra.
2. Калі ўпэўнішся, што сярод каналаў ёсць Белсат TV, а якасць прыёму добрая, замацуй антэну. Жадаем прыемна правесці час з нашымі перадачамі.

Практычная парада:

Перастаўляючыся на Astra, ты не мусіш адмаўляцца ад прыёму дагэтуль ужыванага спадарожніка. Дастаткова паставіць яшчэ адну галоўку (канвертар). Дзякуючы дадатковым канвертарам ты можаш прымаць сігнал нават з некалькіх спадарожнікаў.
3. Калі ў тваёй апаратуры ёсць функцыя аўтаматычнага выбару спадарожніка, табе не трэба варочаць антэну. Дастаткова наставіць параметры: Астра 1 Кг, пазіцыя 19,2° E, палярызацыя H, частата 10773 МГц.

В. У мяне няма абсталявання, а я б хацеў глядзець Белсат.

1. 10 снежня Белсат TV пачынае трансляваць передачы па спадарожніку Астра. Чым далей на Ўсход, тым слабейшы сігнал Астры, таму варта выбраць іншы, магутнейшы спадарожнік.
2. Каб дайсці да кожнага беларускага дому, ад студзеня 2008 году Белсат TV будуць трансляваць таксама па спадарожніку Sirius. Ён прапануе найбольш бясплатных, некадаваных каналаў на расейскай і ўкраінскай мовах. Цяпер да іх далучыцца і доўгачаканы спадарожнікавы тэлеканал на беларускай мове.
3. Ужо сёння можна купіць спадарожнікавую антэну і скіраваць яе на магутны Sirius. Памятай, што замацоўваць антэну трэба па тым баку будынку, які апоўдні асвятляецца сонцам – менавіта з гэтага найцяплейшага пункту на небе да цябе прыйдзе новая тэлевізія Белсат TV.

Для якаснага прыёму правядзі кабель ад антэны да прыёмніка найкарацейшым шляхам, пастарайся, каб ніякія перашкоды (напрыклад, дрэвы) не засланялі антэны. Не вешай талеркі вельмі высока, каб яна не была на ветры.

4. Пошук і настройка каналу адбываецца гэтак жа, як у выпадку кожнага іншага спадарожніка. Усё гэта можна выканаць самастойна, карыстаючыся тэхнічнай інструкцыяй па абслугоўванні антэны. Калі ў цябе ўзнікнуць пытанні, з імі можна звяртацца, напрыклад, да прадаўца.

Белсат TV – тваё права выбару!

Традыцыйныя для многіх друкаваных выданьняў вынікі года падабраныя намі па матар'ялах нашага выданьня, а таксама газэтаў "УзГорак" (Горкі) і "Выбар" (Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў).

Человек года

Тот, кто регулярно читает горецкие газеты, легко угадает имя лауреата. Им стал ВЛАДИМИР ЯКУБОВИЧ. Представлять этого человека жителям Горок вряд ли нужно: музыкант, педагог, общественный деятель и просто человек с положительной жизненной энергией – Володя регулярно дает повод написать о своих добрых делах. Редакция всегда рада такому сотрудничеству, а в следующий номер "УзГорак" готовит очередное интервью с лауреатом.

Событие года

Начало ежедневной подачи горячей воды в квартиры горецких жителей

Дать городу горячую воду каждый день обещало не одно поколение директоров Центральной котельной, а впоследствии – "Тепловой энергетики". И вот наконец – свершилось! Придя домой вечером, мы теперь практически ежедневно (за исключением ремонтов, профилактик, и прочей коммунальной напасти) имеем возможность смыть с себя дачную пыль и постирать белье, не бегая из кухни в ванную с нагретым чайником.

Газэта года

"Вольны горад". (Крычаў)

"Універсалізму" тамтэйшых журналістаў можна з аднаго боку пазайздросьціць, а зь іньшага – паспачуваць. Хлопцы адначасова ўмудраюцца і выпускаць газэту, якую з цікавасьцю чытае ўвесь рэгіен (улічваючы чыноўнікаў), і адбівацца ад нападкаў тых самых "чытачоў" зь вертыкалі, і дапамагаць калегам з суседніх раенаў.

Представление года

Спектакль Могилевского областного драматического театра «Билокси-блюз»

О выступлениях на местной сцене профессиональных артистов приличного уровня в Горках в последние годы как-то подзабыли. Культурная жизнь сводится в основном к приезду широко известных в узких кругах рок-групп и концертам хоть и художественной, но все же – самодеятельности. На этом фоне спектакль «Билокси-блюз», показанный областным драмтеатром на сцене академического ДК выглядит ярким событием в жизни города. А тут еще оказалось, что одна из ведущих актрис театра, Елена Кривонос - наша землячка.

Варварство года

Разгром двумя пьяными студентами (теперь, естественно, бывшими) бетонного забора возле спорткомплекса

Сила есть – ума не надо. Следование этой поговорке привело обоих на скамью подсудимых и лишило семизначных сумм, которые пришлось уплатить за нанесенный ущерб.

Фальстарт года

Отказ горецких клубов от участия в национальных чемпионатах по футболу и гандболу.

Гандболисты «Колоса» стали жертвами созданного в Могилеве местечкового «суперклуба», на который и были переориентированы финансовые потоки. Деньги, точнее – их отсутствие, погубили и Футбольный клуб «Горки». Откуда тут взяться спонсорским финансам, когда экономика региона все громче «поет романсы»…

Шиш года

Получили от своих работодателей бывшие сотрудники печально известного «Парнаса» Несколько десятков человек фактически оказались выброшенными на улицу без оплаты их многомесячного труда. Решения суда о взыскании денег на общую сумму – около 50 миллионов рублей долгое время остаются неисполненными. Формальная причина – переход «Парнаса» под юрисдикцию другой «фирмы» - «Белрос» вместо «Белросстроя». Фактически же владелец ресторана, горе-«олигарх» Игорь Измайлович, при странном попустительстве местной власти перепрятал свои активы «из кармана в карман» и продолжает получать прибыль.

Обозреватель года

Практически в каждом номере газеты мы имеем профессиональное и в то же время – написанное доступным читателю языком экономическое обозрение от Андрея ЮРКОВА. Прогнозы развития экономики нашего региона, выходящие из-под его пера, увы, как правило, сбываются. Разумеется, вины редакции и ее экономического обозревателя в этом нет. Как принято говорить в журналистских кругах, «Самолеты падают потому, что об этом пишут газеты». Другое дело, что по причине следования правдивой профессиональной позиции, этот человек уже не первый год испытывает проблемы с трудоустройством. Вспомним классика: «Ведь нынче любят бессловесных».

Победа года

Успех академических мастеров армрестлинга.

Команда академических силачей и силачек, занявшая под руководством тренера Анатолия Дубкова первое командное на Универсиаде среди всех ВУЗов страны, достойна того, чтобы стать лауреатом в этой номинации.

Сотрудничество года

«УзГорак» - Горецкий РОВД

Примером делового сотрудничества государственных органов и негосударственной прессы может служить наша совместная работа по освещению криминальной обстановки в регионе и пропаганды правовых знаний среди читателей. Несмотря на суховатость формулировки, надеемся, что наши публикации на темы борьбы с преступностью, наведения порядка на дорогах, а также изменений в паспортном режиме, внесли свою лепту в дело соблюдения законности и правопорядка в Горецком районе. При этом у нас есть

Юбілей года

Бялыніцкай газэце "Паходня" споўнілася 14 год.

Для незалежнага выданьня, якое бесперапынна адчувае на сабе "ўвагу" ўладаў, гэта, безумоўна, адметная дата. Традыцыям дэмакратычнай прэсы на Бялынiччыне варта пазайздросьціць і мецъ іх ў якасьці арыентыраў.

Результат года

Спасенные жизни и деньги водителей

Не стремимся похвалиться, но факт есть факт – именно после нашей публикации «Гонки со смертью» ("УзГорак" №23), о крайне опасном перекрестке кольцевой дороги и дороги на Ленино, там был установлены «лежащие полицейские», и регулярные сводки о разбитых машинах и трупах оттуда прекратились.

ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР 3
№ 32, декабрь 2007г.

Новшество года

Для нас и наших читателей таковым стало открытие сайта uzgorak.na.by. Заходите, люди добрые! Читайте, кто что хочет!

Пропажа года

Исчезновение с площади у кинотеатра «Крыница» Стелы Героев.

Сперва с нее пропали портреты героических земляков, а затем куда-то исчез и сам обелиск. Куда и зачем он подевался и по чьему распоряжению был демонтирован, ни в райисполкоме, ни в «Коммунальнике» никто толком так и не объяснил.

Профанация года

Поведение организаторов лотереи «Ваше лото».

Весной этого года столичные тети и дяди использовали детишек из горецкого Социального приюта в качестве «рекламной приманки», а затем оставили их без положенного по условиям объявленной акции денежного приза. Поневоле задумаешься: а так ли уж честно поводятся все остальные розыгрыши?

Акция года

«Наш общий лес»

Под таким девизом Горецкому лесхозу удалось собрать на посадку леса более 200 человек. Причем, кроме организованных студенческих групп и школьников в посадке приняли участие и реальные добровольцы – благодаря грамотно проведенной пиар-кампании. Итог впечатляет: лесом в этот день засажено около 15 гектаров.

Паразуменьне года

Стварэньне Рады дэмсілаў Магілеўшчыны.

У яе ўвайшлі прадстаўнікі палітычных партыяў, рэгіянальных кааліцыяў, ды іньшых незалежных структураў вобласьці. Трэба нагадаць, што стваралася новае аб'яднаньне ня “супраць” а “за”, маючы на ўвазе гатоўнасьць да плённага супрацоўніцтва са ўсімі аднадумцамі, якіх цягам часу становіцца ўсё больш.

Визит года

Посещение нашего города послом Болгарии в Беларуси г-ном Петко Ганчевым.

Дипломат обсуждал с местными властями вопросы культурного, торгово-экономического и научного сотрудничества. Несмотря на высокий официальный статус, посол оказался весьма общительным человеком и с охотой отвечал на все вопросы «УзГорка». После окончания беседы ректор БГСХА Александр Цыганов авторитетно сообщил г-ну Ганчеву, что это, дескать, был корреспондент оппозиционной газеты. Любят у нас играть в политику!

Трофей года

Щука весом в четырнадцать килограммов

Чудо-рыбина, выловленная водитлем «Горгаза» Василием Куртинным, была в этой номинации вне конкуренции.

Слух года

Главный персонаж местного «сарафанного радио» в уходящем году – Александр Ильянов.

Наша газета, как могла, добывала информацию, касающуюся обстоятельств его ареста. Но уж чему-чему, а производству «государственных секретов» на пустом месте наши чиновники обучены по высшему разряду. Сегодня в народе (к которому мы, конечно же, относим и официальных лиц) параллельно существуют две версии: 1)Сидит; 2)Отпустили. Какая из них правдивее – не видно даже с «УзГорка».

Пудзіла года

Рашэньне аб будаўніцве на Магілеўшчыне атамнай электрастанцыі

Па апошніх зьвестках, найбольш верагоднай пляцоўкай для разьмяшчэньня АЭС з'яўляецца тэрыторыя ля вескі Кукшынава, што ў 20 км. ад Горак. З гэтай нагоды тамтэйшыя актывісты ўжо пачалі збор подпісаў супраць такога будаўніцтва. Жыхарам жа іньшых раенаў таксама варта задумацца – як-ніяк, Горкі да іх значна бліжэй, чым Чарнобыль.

Прывітаньне года

Атрымалі выбарцы Магілеўшчыны ад сваіх дэпутатаў палаты прадстаўнікоў.

Можа хто з абраньнікаў і раіўся з народам, як трэба галасаваць пры разглядзе сумнавядомага Закону аб ільготах, але ў нас такіх зьвестак няма. Пазбавіўшы найбольш абяздоленых жыхароў вобласьці амаль што апошняй надзеі на лепшае жыцьце, народныя абраньнікі неяк забыліся скасаваць уласныя прывілеі, ды прывілеі “сяброўвертыкальшчыкаў”, ды і зараз не сьпяшаюцца ў рэгіены са справаздачамі. А іх там вельмі чакае пачынаючы нешта цяміць электарат.

Катаклизм года

Редкостный по продолжительности и размерам град, в течение получаса (данные Агрометеостанции – ровно 30 минут) громивший в городе и его окрестностях все, что попадалось на пути. Шифер на домах, словно простреленный из крупнокалиберного пулемета, уничтоженные посевы, машины без стекол, на крышах которых, по словам одного из владельцев, “словно танцевали чечетку»... Самая крупная градина, которую удалось измерить метеорологам, имела диаметр 58 мм.

Запрет года

Срыв соревнований закрытия сезона по стритрейсингу

Можно понять сотрудников ГАИ, в целях безопасности запретивших проведение автогонок на взлетной полосе. В то же время, в Горках немало организаций, сотрудники которых получают зарплату именно за организацию свободного времени молодежи. Пока с их стороны энтузиазма в поддержке инициативных ребят, организовавших соревнования, не наблюдается.

Штэмпсель года

З'явіўся на тэлеэкранах некалькі дзен таму

Цягам амаль усяго года дзяржаўныя тэлеканалы тлумілі нам галовы, распавядаючы, што «Советская Белоруссия» - гэта не закасьцянелы рэлікт мінулага, а лепшая грамадзка-палітычная газэта краіны. Зараз жа «піяршчыкі» з БТ пайшлі яшчэ далей. Напэўна ўсе бачылі, як на тэлеэкране на старонку гэтай газэты нейкая таямнічая рука ставіць авальную пячатку. Надпіс на гэтым «штэмпселі» катэгарычна сьцвярджае: «Написанному верить». Паверылі. Перанялі. Развіваем ідэю.

Хвароба года

Адстаўка Уладзімера Канаплева

Сьпікер Палаты прадстаўнікоў, а па сумяшчальніцтву – дэпутат ад “ключавой” акругі Магілеўшчыны, нечакана захварэў ды так моцна, што папрасіўся ў адстаўку. Неяк так саўпала, што на

ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР

№ 32, декабрь 2007г.

той жа тэрыторыі вельмі хутка быў вызвалены ад пасады і арыштаваны цяпер ужо былы старшыня Бялыніцкага райвыканкама Аляксандар Ільянаў.

Неўзабаве першы зь іх падлячыўся і вярнуўся ў ППНС шараговым дэпутатам. Цяпер жыхары Бялынiччыны гадаюць, у якім стане здароўʼя, у якой якасьці і калі прыедзе да іх другі.

Прывіды года

Былі сустрэныя па дарозе на Крапівеньскае поле, дзе патрыеты з Магілеўшчыны мелі намер разам зь іншымі беларускімі дэмакратамі адсьвяткаваць Дзень вайсковай славы. Апранутыя ў форму аршанскіх міліцыянтаў, нібы паўстаўшыя з таго сьвету здані разьбітых пад Воршай маскоўцаў, рабілі ўсе, каб гаспадары гэтай зямлі – беларусы ня трапілі на сьвята. Урэшце, кожны з нас адсьвяткаваў гэты дзень па-свойму. Але прыдзе час – пераможам, як нашыя продкі. І будзе гэтая зямля сапраўды беларускай, 8-е верасьня – дзяржаўным сьвятам, а прывіды сыйдуць у ад, дзе ім і месца.

Статак года

Прыватна-лагодныя прадпрымальнікі "Памяркоўная", а па сутнасьці – стравусіная пазыцыя тых, хто лічыць сябе бізнэсоўцамі, прывяла да сытуацыі, калі дробны бізнэс у краіне, і, прынамсі, на Магілеўшчыне, апынуўся пад пагрозай ліквідаваньня. Зь іньшага боку, можа гэта й добра, што з рынку сыйдуць тыя, хто так і ня выпрацаваў у сябе псыхалегіі гаспадара, здольнага абараніць сваю справу ды маемасьць.

Анекдот года:

Два глиста высунулись наружу:
- Мама, а что это большое и светит?
- Это, сынок, солнце.
- А что это плещется и сверкает?
- Это, сынок, море.
- А что это зеленое и хорошо пахнет?
- Это, сынок, лес.
- Мама, а почему мы живем в жопе?
- А это, сынок, наша Родина!

Стань 1768-м!

Прыхільнікі Руху "За Свабоду" выпусцілі серыю значакаў з лічбамі "1768". Яны сімвалізуюць тое, што колькасць незадаволеных аўтарытарнай уладай людзей, насамрэч заўсёды болей, чым заяўляе кіраўніцтва КДБ.

Гаворачы пра апазыцыю на сваёй першай прэс-канферэнцыі, старшыня КДБ Юры Жадобін адзначыў: «Я б не сказаў, што яны ўяўляюць нейкую пагрозу нацыянальнай бясьпецы, у так званую супольнасьць дэструктыўных элемэнтаў уваходзіць усяго 1767 асобаў. Мы іх усіх ведаем пайменна, і іх ня робіцца ні больш, ні менш».

Аднак беларусы здзіўленыя тым, што КДБ не заўважае відавочнага. Колькасць прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў насамрэч імкліва расце, а папулярнасць аўтарытарнай улады няўхільна зьмяншаецца.

– Лічбы на нашым значку сімвалізуюць тое, што колькасць незадаволеных аўтарытарнай уладай людзей, насамрэч заўсёды будзе болей, чым пра тое дакладаюць прыдворныя генералы, галоўнай мэтай якіх зʼяўляецца імкненне супакоіць свайго кіраўніка, – кажа намеснік лідэра Руху "За Свабоду" Юрась Губарэвіч.

У Вас яшчэ ёсьць шанс стаць 1768-ым. Калі вы маеце жаданне прадэманстраваць сваю прыналежнасць да лепшых людзей краіны, сапраўдных патрыётаў Беларусі, пытайцеся пра значакі ў сябраў Руху.

ОБНАГЛЕВШИЕ ОТ ВСЕДОЗВОЛЕННОСТИ ЧИНОВНИКИ ДАЖЕ НЕ УТРУЖДАЛИ СЕБЯ ПОИСКОМ АРГУМЕНТОВ

Состоялось заседание Президиума Политсовета ОДС, на котором принят ряд заявлений. В том числе, по поводу отношения местных органов власти к конституционному праву граждан на выражение своего мнения. Приводим текст Заявления полностью:

ЗАЯВЛЕНИЕ

Объединенных демократических сил Беларуси
О грубейшем нарушении конституционных прав граждан

В рамках общереспубликанской кампании протеста «Социальный марш», направленной на защиту права граждан на достойную современного человека жизнь, активистами ОДС по всей стране было подано более 800 заявок на проведение пикетов протеста против ликвидации с 17 декабря 2007 года социальных гарантий для миллионов граждан Республики Беларусь.

В нарушение Конституции Республики Беларусь и Закона «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь» исполнительные комитеты дали разрешение на проведение лишь двух пикетов. Циничное и хамское отношение местных органов власти к конституционному праву граждан на публичное выражение своего мнения исходило из президентской «вертикали». Обнаглевшие от вседозволенности чиновники даже не утруждали себя поиском каких-либо аргументов, чтобы отказать людям в проведении пикетов.

ОДС в ближайшие дни направит в Конституционный Суд обращение по факту массового нарушения местными органами власти прав граждан Беларуси на проведение пикетирования 16 декабря 2007 года и окажет гражданам необходимую помощь при обжаловании незаконных отказов на проведение пикетов в судах.

Попытки правящего режима сорвать протесты граждан в рамках «Социального марша» не принесут результата. Миллионы людей уже почувствовали антинародный характер проводимой в государстве политики. Объединенные демократические силы Беларуси продолжат борьбу по защите социальных прав граждан.

Принято на заседании Президиума Политсовета ОДС 19 декабря 2007 года

«ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР»
Антибашистская газета №32, декабрь 2007г.
Издатель и главный редактор - ЭДУАРД БРОКАРЕВ.
Brok61@yandex.ru Т. 545 89 83. Издание непериодическое, выходит по мере возможности. Тираж 299 экземпляров.
В номере использованы материалы сайтов: http://www.svaboda.org/ http://www.milinkevich.org/ http://www.racyja.com/ http://www.milinkewits.org/ http://www.pbnf.org/ belsat.home.pl/ http://www.uzgorak.na.by/